**24.** Вы, напэўна, не раз чулі такія ўстойлівыя выразы:

*1) разводзіць рукамі; 2) махнуць рукой; 3) складваць рукі; 4) ламаць рукі.*

Якія значэнні яны маюць?

*а) ‘абыякавасць, няўвага’; б) ‘адчай, моцнае эмацыянальнае ўзрушэнне’;*
*в) ‘бяздзейнічаць’; г) прызнаць сябе бездапаможным, нядольным рашыць пытанне’.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б. **Д)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б.

---

**25.** Дадзены сказы:

*1. Дзядуліна карзінка была напоўнена аднымі баравікамі.*
*2. Маленькая сабака з цікаўнасцю выглядвала з будкі.*
*3. Воз рыпеў пад цяжарам дроў.*

У якіх сказах дапушчаны граматычныя памылкі?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**26.** Малая сцэна Купалаўскага тэатра размясцілася ў памяшканні былога кінатэатра … .

**А)** “Беларусь”. **Б)** “Навіны дня”. **В)** “Радзіма”. **Г)** “Аўрора”. **Д)** “Кастрычнік”.

---

**27.** Устанавіце адпаведнасць паміж часткамі крылатых выразаў.

| | |
|---|---|
| *1) Добра быць у дарозе, …* | *а) як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной (М. Багдановіч).* |
| *2) І чарсцвее душа …* | *б) у ім бывае шторм і штыль (П. Броўка).* |
| *3) Бачу я, з прыродай зліўшыся душой, …* | *в) якую ты сам сабе выбіраеш (Я. Колас).* |
| *4) Людское сэрца быццам мора, …* | *г) ад карозіі безадказных, бяздумных слоў (В. Вітка).* |

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Д)** 1-а, 2-в, 3-б, 4-г.

---

**28.** Як правільна напісаць назву кандытарскага вырабу з міндальнага цеста?

**А)** марцыпан. **Б)** марцапан. **В)** марцэпан. **Г)** марцупан. **Д)** марцопан.

---

**29.** 3 чэрвеня 1912 года Янка Купала закончыў пісаць п’есу “Паўлінка”. Сцэнічнае жыццё твора пачалося ў 1913 годзе.

27 студзеня 1913 года спектакль “Паўлінка” адбыўся ў Вільні, 9 лютага – у Санкт-Пецярбургу, а 15 жніўня – у … .

**А)** Рубяжэвічах. **Б)** Радашковічах. **В)** Мінску. **Г)** Гродна. **Д)** Пінску.

---

**30.** Вы, напэўна, не раз чулі раманс “Калі я на пошце служыў ямшчыком”. Сюжэт дадзенага твора быў заснаваны на рэальных падзеях. Аўтар, калі быў на базары ў Міры, зайшоў у харчэўню падсілкавацца. Паколькі было мала свабодных месцаў, ён падсеў да незнаёмага чалавека сталага ўзросту і, каб неяк пачаць гутарку, запытаўся, чаму той вельмі сумны. Пачутая гісторыя так уразіла паэта, што ён за адну ноч напісаў верш, які з часам быў пакладзены на музыку. Як звалі паэта?

**А)** Адам Міцкевіч. **Б)** Францішак Багушэвіч. **В)** Ян Чачот.
**Г)** Уладзіслаў Сыракомля. **Д)** Янка Лучына.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
КОНКУРС
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 4. Тыраж 11100 экз. 2022 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2022»

*Чацвер, 17 лютага 2022 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Прачытайце вершаваны каламбур П. Шыбута. Падкрэсленыя словы з’яўляюцца … .

*Стараўся браць на мушку*
*Малюсенькую мушку.*

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі.
**Г)** паронімамі. **Д)** амафонамі.

---

**2.** Колькі ўсяго прыназоўнікаў ужыта ў прапанаваным сказе?

*З бліжняй бярозы аддзяліўся залацісты лісток, пакружыўся ў паветры і бясшумна апусціўся ў лужыну на дарозе.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**3.** Дадзены назвы беларускіх рэк: *1) Зэльвянка; 2) Бобрык; 3) Бярэзіна.* У якой назве “схаваліся” дзеяслоў абвеснага ладу і імя дзяўчынкі (склады і літары не перастаўляць)?

**А)** ва ўсіх назвах. **Б)** няма такой назвы. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д) у 3.**

---

**4.** Якія назвы твораў Якуба Коласа патрэбна напісаць праз злучок?

*1) “Сымон(музыка)”; 2) “Савось(распуснік)”; 3) “Рак(вусач)”.*

**А)** усе назвы. **Б)** няма такіх назваў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**5.** У якіх прыкладах дзеяслоў з часціцамі ***бы(б), жа(ж)*** правільна напісаны?

*1) прыляцеў б; 2) прыехала б; 3) чытаў бы; 4) глядзела жа.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**6.** Прачытайце вершаваныя радкі П. Макаля. Падкрэслены сказ … .

> *<u>Паэзія –</u>*
> *<u>Крылы ў неба,</u>*
> *<u>Што вучаць зямлёй даражыць.</u>*
> *Паэзіяй дыхаць трэба,*
> *Паэзіяй трэба жыць…*

**А)** просты. **Б)** складаны.
**В)** бяззлучнікавы. **Г)** складаназалежны.
**Д)** складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

---

**7.** Які назоўнік прапушчаны ў радках верша П. Броўкі?

> *Сонца за борам жар-птушкай садзіцца.*
> *Штосьці спявае пяшчотнае …,*
> *Пахне чабор, пахне чабор.*

**А)** гусляр. **Б)** шпак. **В)** бор.
**Г)** лес. **Д)** салавей.

---

**8.** Прачытайце ўважліва сказы:
*1. Вядома, што ад старажытных часоў людзі стваралі жыццёвую прастору не толькі для расліннасці і жывёльнага свету, але і для саміх сябе.*
*2. Увайшлі ў сяло і быццам нырнулі пад цёмную павець.*
*3. Гукні ў гарах – і рэха табе адгукнецца.*
Які сказ з’яўляецца простым?
**А)** усе сказы. **Б)** няма такога сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**9.** Дадзены назвы прылад (матэрыялу):
*а) пуга; б) паркаль; в) горан; г) рыдлёўка; д) скура.*
Хто імі карыстаецца?
*1) каваль; 2) гарбар; 3) кравец; 4) грабар; 5) пастух.*
**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г, 5-д. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-д, 5-в. **В)** 1-в, 2-д, 3-б, 4-г, 5-а.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-д, 4-а, 5-б. **Д)** 1-д, 2-в, 3-а, 4-б, 5-г.

---

**10.** Дадзены словы: *1) р..ж..сіраваць; 2) р..ч..ва.* Якія літары прапушчаны?
**А)** а, а. **Б)** а, э. **В)** э, э. **Г)** э, ы. **Д)** ы, э.

---

**11.** Зміцер запісваў пад дыктоўку словы:
*1) вяснавы; 2) весялун; 3) весялуны; 4) вяровачны.*
Якія словы хлопчык напісаў няправільна?
**А)** усе словы. **Б)** усе словы напісаў правільна. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**12.** Колькі [д] у словах вершаваных радкоў з паэмы Якуба Коласа “Новая зямля”?

> *Угрэла сонца. Жней чародкі*
> *Ідуць паважна, як лябёдкі,*
> *У хустках лёгкіх, кофты белы.*
> *Іх рукі дужа загарэлы.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**13.** У народзе, калі характарызуюць чалавека, які бяздзейнічае, з’яўляецца пасіўным, не праяўляе актыўнасці ў чым-небудзь, гавораць:
*1) “З саней у жыта скача”;* *2) “ Ад такога чакай зімою кветак”;*
*3) “Вочы ў жменю бярэ”;* *4) “Аж ногі за вушы заплятаюцца”;*
*5) “Хапун не ўхопіць”.*
Выберыце патрэбны прыклад устойлівага спалучэння.
**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**14.** Якія словазлучэнні з дадзеных утвораны няправільна?
*1) чацвярым кнігам; 2) дваім дрэвам; 3) траім кацянятам.*
**А)** усе словазлучэнні. **Б)** няма такіх словазлучэнняў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**15.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце літару **э**?
*1) д..лікатэс; 2) экз..мпляр; 3) д..ктрына; 4) ц..лафан.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**16.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя назоўнікі ў форме меснага склону.
*1) на лузе; 2) на кругу; 3) на стозе; 4) на паверсе.*
**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**17.** Колькі дзеепрыметнікаў у сказе?
*Часам куры пераходзілі на марудны крок і вышуквалі сярод расталага надворку рэшткі разлітай ці растрэсенай і замёрзлай зімою ежы.*
**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**18.** Якія словы з прапанаваных маюць нулявы канчатак?
*1) чытаў; 2) думаючы; 3) маёр; 4) цераз.*
**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

---

**19.** Прачытайце ўважліва сказ:
*– **І-іга-га-га-га**! – нібыта падбадзёрваў конь сябе і зноў шпарка імчаўся наперад, выдыхаючы ў марознае паветра густыя клубы пары.*
Выдзеленае слова з’яўляецца … .
**А)** зваротkам. **Б)** выклічнікам. **В)** гукапераймальным словам.
**Г)** параўнальным зваротам. **Д)** пабочным словам.

---

**20.** Які знак прыпынку неабходна паставіць на месцы пропуску ў сказе?
*Каса не слізгала нават па высока зрэзанаых, засохлых карэньчыках, якія засталіся ад першага ўкосу_ яны адышлі ў расе і рэзаліся без натугі, амаль нячутна, амаль так, як атава.*
**А)** знак прыпынку не патрэбны. **Б)** коску. **В)** кропку з коскай.
**Г)** двукроп’е. **Д)** працяжнік.

---

**21.** У якіх сказах з дадзеных няправільна пастаўлены знакі прыпынку?
*1. Трэба сказаць, што на паляванні спаборнічае ўсё – і вопыт, і кемлівасць, і спрыт.*
*2. Летам у лесе пачынаюць вылазіць: баравікі, лісічкі, асавічкі, казлякі і шампіньёны.*
*3. Усё зацвіло ў садзе: і яблыні, і грушы, і вішні.*
*4. Поле, луг і лес – усё пачарнела ад золкіх асенніх дажджоў.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**22.** Прачытайце ўважліва сказы.
*1. Падняўшыся на вяршыню Дзяржынскай гары, становіцца цяжэй дыхаць.*
*2. Вандруючы па замежных краінах, знаёмішся са звычаямі розных народаў.*
*3. Пасадзіўшы малады дубок, жалудоў дачакаешся не хутка.*
У якім сказе парушаны сінтаксічныя нормы?
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**23.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***а***?
*1) р..візія; 2) р..ванш; 3) ч..снок; 4) р..рытэт; 5) ц..ліндр.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 2, 3. **Г)** у 3, 4. **Д)** у 4, 5.